УДК 2

# АДЛЮСТРАВАННЕ РЭЛІГІЙНЫХ АДНОСІН НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У РАМАНЕ У. КАРАТКЕВІЧА “КАЛАСЫ ПАД СЯРПОМ ТВАІМ”

**Самалазава Наталля Міхайлаўна,**
ДУА “Сярэдняя школа № 1 г. Круглае” (г. Круглае, Беларусь)



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*У рабоце зроблена спроба адлюставаць рэлігійныя адносіны на беларускіх землях у перыяд з канца X да сярэдзіны XVIII ст. на падставе рамана У. Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім".*

У рамане У. Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім" рэлігійныя адносіны не з'яўляюцца асноўнай тэмай. Аднак без іх шматлікія палітычныя і сацыяльныя працэссы тагачаснага грамадства засталіся б незразумелымі.

У кнізе першай "Выйсце крыніц" пан Юры распавядае сыну пра будаўніцтва магільні Загорскіх : "…Тут было паганскае капішча… Якому богу яны маліліся – ніхто не ведае. Бо з іх не ўцалеў ніхто… Яны пакінулі гэтыя камяні і гэты серп маладзіка і зніклі, як аблокі. Тут яны збіраліся, а гэты камень і чаша на ім былі, відаць, ахвярнікам. Колькі год так было – невядома. А потым з Полацка прыйшоў Дняпром бліжні дружыннік Глеб, і тады гэтыя людзі ўбачылі кроў… Капішча шукалі доўга. і знайшлі… і вось пад гэтымі камянямі загінулі ўсе яго абаронцы. Да аднаго." [3, с. 74]. Ва ўрыўку размова ідзе пра адзін з самых неадназначных перыядаў гісторыі Старажытнай Русі – хрышчэнне. Дакладных звестак аб прыняцці хрысціянства на беларускіх землях пісьмовыя крыніцы не захавалі. Хутчэй за ўсё, далучэнне беларускіх зямель да новай рэлігіі ішло мірным шляхам. Але аўтар дапускае некаторае адступленне і пераносіць падзеі, якія адбываліся на поўдні і поўначы Старажытнарускай дзяржавы ў беларускае Падняпроўе. Сапраўды, насельніцтва Кіева ў канцы X ст. стала хрысціянскім пад прымусам князя Уладзіміра. Аб чым сведчаць радкі з "Аповесці мінулых гадоў": "Аще не обрящеться кто заутра на рѣцѣ, богатъ ли, убогъ, или нищь, или работенъ – противникъ мнѣ да будеть"[4]. Недабраахвотна ішло распаўсюджванне новай веры і сярод жыхароў Ноўгарада. Аб тых падзеях захавалася нават прыказка, што "Пуцята хрысціў іх мячом, а Дабрыня агнём" [5, с. 115].

Наступныя словы пана Юрыя характарызуюць час, калі хрысціянства толькі замацоўвалася ў грамадстве: "…Тут было раней два рады камянёў. Вонкавы ўзялі і залажылі ў падмурак будынка. Але потым Глеб раздумаў. … Таму ён проста загадаў асвяціць галоўны камень вобразам пастыра, але тых камянёў з падмурка не выняў. " [3, с. 75]. Язычніцтва мела на беларускіх землях вельмі глыбокія карані. На працягу тысячагоддзяў яно з'яўлялася цэнтрам светапогляду чалавека, давала адказы на пытанні аб паходжанні свету, розных прыродных з'яў. Адразу знікнуць яно не магло. На Русі хрысціянства само засвоіла шэраг язычніцкіх уяўленняў і абрадаў. Так язычніцкія святы былі трансфарміраваны ў хрысціянскія, а на месцы былых капішчаў узніклі цэрквы. А саму сітуацыю, у якой апынулася славянскае насельніцтва, характарызуе паняцце дваяверства [2, с. 283].

Наступны ўрывак характарызуе больш позні час і адлюстроўвае няпростыя адносіны паміж хрысціянскімі канфесіямі. Пасля таго, як манахі звянчалі дачку Вежы з афіцэрам, той загадаў абстраляць з гармат праваслаўны манастыр. На зваротным шляху ваякі "… ўзялі без бою, толькі выламаўшы браму, каталіцкі кляштар і за суткі выпілі ў ім усе віны і лікёры… Манахі, узрадаваныя ганьбе канкурэнтаў, самі частавалі ваякаў. Чорт з імі, з лікёрамі! Будуць яшчэ. Але ж пан схізматув поперал…" [3, с. 175]. Далейшы аповед, яшчэ больш паглыбляе разуменне складанасці сітуацыі: "Калі нарадзіўся другі ўнук — ён ажывіўся. … Бацькоўскай уладай ён загадаў, каб унука хрысцілі ў касцёле… Народ раздзялілі гэтай верай. Сварацца, як быццам не адной маці дзеці. І кожны лічыць, што мае рацыю, калі гыркае. Дык няхай хаця два браты будуць іншай веры." [3, с. 185]. Пасля расколу хрысціянскай царквы ў 1054 г. насельніцтва беларускіх зямель не адразу адчула на сабе супярэчнасці паміж дзвюма канфесіямі. Першыя вялікія князі літоўскія аднолькава ставіліся да розных рэлігій, не перашкаджалі іх распаўсюджанню. Напрыклад, Гедзімін, застаючыся язычнікам, праяўляў сапраўдную рэлігійную талерантнасць. Пад час яго кіравання будаваліся як праваслаўныя, так і каталіцкія храмы [5, с. 117]. Яго пераемнікі прытрымліваліся традыцый верацярпімасці



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

аж да пачатку княжання Ягайлы. Сітуацыя змянілася пасля выдання прывілея 1387 г. Толькі феадалы каталіцкага веравызнання атрымалі неабмежаваныя правы па распараджэнні сваёй уласнасцю. У далейшым такое становішча было падмацавана Гарадзельскай уніяй 1413 г. Згодна з яе ўмовамі права займаць дзяржаўныя пасады, удзельнічаць у абранні вялікага князя маглі толькі вернікі-каталікі [1, с. 495].

Вынікамі такой дыскрымінацыі ў адносіных да прадстаўнікоў праваслаўнай канфесіі стала парушэнне адзінства дзяржавы. Пад час грамадзянскай вайны 30-х гг. XV ст. рэлігійнае пытанне было разменнай манетай у барацьбе за ўладу. Праваслаўная царква і свецкая знаць дамагаліся таго, каб атрымаць аднолькавыя з каталікамі правы. І толькі ў 1563 г. вялікі князь літоўскі Жыгімонт Аўгуст адмяніў Гарадзельскі прывілей, ураўноўваючы ў правах усю шляхту незалежна ад веравызнання. А Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. заканадаўча зацвердзіў палажэнні аб верацярпімасці [1, с. 112].

Аднак гэтага аказалася недастаткова, каб прымірыць праціўнікаў. Рэфармацыя, а затым і Контррэфармацыя не толькі не палепшылі становішча праваслаўнай царквы, але і ператварылі яе нароўні з пратэстантамі ў аб’ект праследвання. У такіх умовах заключэнне Берасцейскай уніі выглядала заканамерна. Каталікі імкнуліся пашырыць колькасць сваіх вернікаў і атрымаць саюзніка ў барацьбе з Рэфармацыяй, а праваслаўная царква жадала пашырэння сваіх правоў [1, с. 316].

У XVII–XVIII стст. рэлігійная сітуацыя абвастрылася да такой ступені, што ўзнікла так званае “дысідэнтскае пытанне”, якое дало падставу Расіі ўмяшацца ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай і ажыццявіць яе падзелы.

З далучэннем беларусскіх зямель да Расійскай імперыі насельніцтва сутыкнулася з новай для сябе рэлігійнай сітуацыяй. У дзяржаве, дзе палітыка выражалася формулай “Праваслаўе. Самадзяржаўе. Народнасць”, каталіцкая царква страціла сваё дамінуючае становішча [5, с. 134].

У пытанні вывучэння рэлігійных адносін прыцягвае ўвагу асоба старога Вежы. Яго адносіны да рэлігіі аўтар перадаў адным трапным выказваннем: “…З нешматлікімі сябрамі ён замкнуўся ў маёнтку, стварыўшы нешта накшталт братэрства, філосафам якога быў Эпікур, а рэлігіяй – Вальтэр.” [3, с. 184]. Вежа – адлюстраванне веку. Ён нарадзіўся і сфарміраваўся як асоба ў другой палове XVIII ст. Гэты час адзначаны росквітам ідэй Асветніцтва і вольнадумства. Свабода думак распаўсюджвалася не толькі на палітычнае, але і на рэлігійнае жыццё. Пасля рэлігійнага засілля Контррэфармацыі і барацьбы з атэізмам, Асветніцтва дало далейшы штуршок для фарміравання свабоды веравызнання. Вежа не з’яўляецца ў прамым сэнсе атэістам. Аднак кожны яго ўчынак, кожнае выказванне – гэта пратэст супраць рэлігійных устояў.

Такім чынам, у рамане У. Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім” адлюставана эвалюцыя рэлігійных адносін на беларускіх землях, паказаны асноўныя этапы развіцця свабоды веравызнання.

## Літаратура


1. Вялікае княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. Т. 1 : Абаленскі – Кадэнцыя / рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2007. – 688 с. : іл.

2. Гісторыя Беларусі : у 6 т. Т. 1. Старажытная Беларусь : Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / рэдкал. : М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000. – 351 с. : іл.

3. Караткевіч, У. Каласы пад сярпом тваім : раман : у 2 кн. Кн. 1. Выйсце крыніц / Уладзімір Караткевіч. – Мінск : Ураджай, 2002. – 398 с. : іл.

4. Повесть временных лет [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://lib.pushkinskijdom.ru/Default.aspx?tabid=4869. – Дата доступа: 19.02.2018.

5. Старостенко, В. В. Религия и свобода совести в Беларуси : очерки истории : монография / В. В. Старостенко. – Могилев : УО «МГУ им. А.А. Кулешова», 2011. – 272 с. : ил.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова